# КВАРТАЛ ЮВЕЛІРАЎ

Полацк працягвае **адкрываць** свае **таямніцы.** Археалагічныя раскопкі, якія вядуцца **на тэрыторыі стадыёна** па вул.Стралецкай, зноў здзівілі ўнікальнымі знаходкамі.



Аляксей Коц расказвае пра новыя знаходкі.

Самая сенсацыйная з іх, якая змяняе ўяўленне пра гэтую частку горада, — так званы квартал ювеліраў. І для гэтай высновы ёсць пераканаўчыя доказы. Аляксей Коц, вядомы археолаг, старшы выкладчык кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржуніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай, падзяліўся падрабязнасцямі:

— *Для звычайнага разумення: мы знайшлі ў кожным шурфе, якія заклалі на тэрыторыі стадыёна, сляды апрацоўкі каштоўных металаў. Сляды ювелірнай вытворчасці прысутнічаюць паўсюдна. Як доказ — у двух шурфах выявілі рэшткі спецыяльных плавільных печаў і больш за 700 фрагментаў тыгляў (сасудаў для плаўкі металаў). Унікальнасць знаходак заключаецца менавіта ў іх колькасці. Па Беларусі знойдзена каля 300 такіх фрагментаў, а ў Полацку толькі падчас гэтых раскопак, у адным месцы, — амаль удвая больш! Таксама трапіліся кавалачкі паліхромных пацерак, рэшткі керамічных вырабаў, фрагменты посуду і інш. Мы сустрэлі вялікую колькасць матэрыялаў, якія дазваляюць датаваць дадзеныя комплексы не пазней XI стагоддзя. Гэта адзіны ў Беларусі такі буйны аб'ект, які займае велізарную плошчу, і яго можна звязваць з ювелірным рамяством менавіта гэтага часу.*

Зроблены спектральны аналіз знойдзеных тыгляў дае падставу сцвярджаць пра арганізацыю розных відаў ювелірнай вытворчасці ў адным месцы. Канцэнтрацыя ювелірных майстэрняў была даволі высокая для старажытнага горада.

Аляксей Леанідавіч спадзяецца, што будуць знойдзены і іншыя артэфакты, якія змогуць сведчыць пра яшчэ больш ранні пачатак ювелірнага рамяства. Гэта пацвярджаецца і археалагічнымі даследаваннямі: калісьці рэшткі ювелірнай вытворчасці былі выяўлены метрах у 150 ад стадыёна. А ў 1984 годзе тут знайшлі залаты скарб з 6 важкіх прадметаў, які цяпер захоўваецца ў Полацкім Нацыянальным гісторыка-культурным музеі-запаведніку.



…Полацк імкліва развіваецца. Узводзяцца новыя будынкі, рамантуюцца старыя памяшканні. І папярэдняе правядзенне археалагічных даследванняў ужо стала звыклай справай. Мы разумеем, што неабходна вывучаць і захоўваць унікальную гістарычную спадчыну, беражліва ставіцца да яе здабыткаў, якія адкрыюць яшчэ не адну цікавую старонку полацкай гісторыі.

**Святлана АЛЬСЕВІЧ.**
**Фота Віктара ЧАРНЯЎСКАГА.**